X Віцебская абласная партыйная канферэнцыя

СПРАВАЗДАЧА АБ РАБОЦЕ ВІЦЕБСКАГА АБКОМА КПБ

Даклад сакратара абкома КПБ тав. У. Е. ЛАБАНКА

Таварышы! Урачыста адсвяткаваўшы 40-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, наша краіна ўступіла ў пятае дзесяцігоддзе свайго існавання, і ў поўным росквіце творчых сіл ідзе да перамогі камунізма.

XX з'езд КПСС азарыў святлом марксісцка-ленінскай тэорыі нашу рэчаіснасць, разгарнуў шырокія далі і перспектывы перад працоўнымі, заклікаў іх да актыўнай, натхнёнай барацьбы за камунізм. Ён вынес рашэнні, якія ўвойдуць у гісторыю Савецкай дзяржавы як пуцяводныя вехі яе развіцця.

Выконваючы гістарычныя рашэнні XX з'езда КПСС, савецкі народ дабіўся новых выдатных поспехаў у развіцці прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і культуры. У цяперашні час наша краіна па аб'ёму прамысловай прадукцыі выйшла на першае месца ў Еўропе і на другое — у свеце.

Перыяд пасля XX з'езда КПСС азнаменаван цвёрдым усталяваннем ленінскіх норм партыйнага жыцця і прынцыпаў партыйнага кіраўніцтва, далейшым развіццём сацыялістычнай дэмакратыі. Партыя рашуча і паслядоўна павяла барацьбу за ліквідацыю вынікаў культу асобы, правяла вялікую работу па ўмацаванню адзінства і маналітнасці партыйных радоў.

Савецкі Саюз атрымаў перамогі вялікага гістарычнага значэння ў галіне навукі і тэхнікі. Вось ужо трэці год запуск першай у свеце атамнай электрастанцыя. Каля года ў г. Дубна Маскоўскай вобласці ў Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследаванняў паспяхова працуе сінхрафазатрон — буйнейшая ў свеце атамная машына. Спушчан на ваду першы ў свеце атамны ледакол «Ленін». Нашай краіне належыць першынство ў стварэнні міжкантынентальнай балістычнай ракеты і сродкаў, якія забяспечваюць яе запуск. Паспяхова запушчаны штучныя спадарожнікі Зямлі — першыя пасланцы чалавецтва ў космас.

У знешнепалітычнай галіне Савецкая дзяржава праводзіла і праводзіць паслядоўную барацьбу за разрадку міжнароднай напружанасці, за ўмацаванне міру і давер'я паміж народамі, за забеспячэнне бяспекі і згуртаванне краін сацыялістычнага лагера, зрывае спробы імперыялістычных дзяржаў развязаць новую вайну.

Камуністычная партыя цвёрда і ўпэўнена вядзе нашу краіну па ленінскаму шляху. Савецкія людзі бязмежна давяраюць свайму калектыўнаму правадыру і кіраўніку —Камуністычнай партыі і яе Ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту. У грандыёзных справах сваёй партыі савецкія людзі бачаць увасабленне мудрасці і энергіі народа, вераць у правільнасць яе палітыкі, заснаванай на ўсепераможным вучэнні марксізма-ленінізма.

Абласная партыйная арганізацыя прыйшла да сваёй X канферэнцыі яшчэ больш узмацнеўшай і згуртаванай вакол Ленінскага Цэнтральнага Камітэта нашай партыі, гатовай выканаць любое заданне Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.

Дазвольце далажыць канферэнцыі аб дзейнасці абласнога камітэта партыі за справаздачны перыяд.

Аб кіраўніцтве прамысловасцю, транспартам і будаўніцтвам

Кіруючыся рашэннямі XX з'езда КПСС і наступнымі пастановамі партыі і ўрада, абласная партыйная арганізацыя правяла вялікую работу па развіццю прамысловасці, транспарту і будаўніцтва. Аб'ём прамысловай вытворчасці за апошнія два гады павялічыўся на 32,2 працэнта і склаў 155 працэнтаў да даваеннага ўзроўню.

За справаздачны перыяд уведзены ў эксплуатацыю завод жалезабетонных вырабаў, торфапрадпрыемства «Дзевінскі мох» у Багушэўскім раёне. Заканчваецца будаўніцтва заводаў радыёдэталей і шкловалакна. Расшыраны магутнасці станказаводаў, Віцебскага млынкамбіната, Полацкай ЦЭЦ, заводаў швейных машын і электравымяральных прыбораў. Намнога павялічылася вытворчасць станкоў, прыбораў, швейных машын, зборных жалезабетонных канструкцый, цэглы, мэблі, скуранога абутку, швейных вырабаў, сметанкавага масла, каўбасных вырабаў, мяса і г. д. У бягучым годзе пачынаецца будаўніцтва нафтаперапрацоўчага завода ў Полацку і другой чаргі Аршанскага ільнокамбіната.

На металаапрацоўчых прадпрыемствах усё больш шырокае ўжыванне знаходзяць такія перадавыя тэхналагічныя працэсы, як кокільнае і цэнтрабежнае ліццё, скорасное і сілавое рэзанне металаў. На заводзе электравымяральных прыбораў укаранёна ліццё пад ціскам, што павялічыла прадукцыйнасць працы ў два разы. Ужыванне больш дасканалага метаду апрацоўкі раду дэталей на Аршанскім заводзе швейных машын дазволіла павялічыць прадукцыйнасць працы на гэтых аперацыях у 20 разоў і дабіцца эканоміі металу на 30—35 працэнтаў.

Тысячы рабочых, інжынераў і тэхнікаў уносяць каштоўныя прапановы, накіраваныя на максімальнае выкарыстанне ўнутраных рэзерваў. У прайшоўшым годзе 2.300 наватараў унеслі больш 4.300 прапаноў, з якіх 3.000 ужо ўкаранёны ў вытворчасць і далі эканамічны эфект больш 15 мільёнаў рублёў. Сярод рацыяналізатараў — лепшыя перадавікі вытворчасці: завода імя Камінтэрна — тав. Салаўёў, завода заточных станкоў — тт. Літошка, Драбышэўскі, фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» — тав. Смірноў, завода электравымяральных прыбораў — тав Сільцоў, панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» — тав. Сокалаў, Полацкага паравознага дэпо — тав. Акуцёнак, Віцебскага вагоннага ўчастка — тав. Бухаўцоў, Аршанскага ільнокамбіната — тав. Цяльцоў, завода швейных машын— тав. Савіцкі і многія іншыя.

Перабудова кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам у адпаведнасці з рашэннямі ЦК КПСС садзейнічала канкрэтызацыі кіраўніцтва гаспадаркай з боку партыйных і савецкіх органаў і ў сувязі з гэтым паляпшэнню работы прамысловасці ў прайшоўшым годзе.

Калектывы прамысловых прадпрыемстваў вобласці датэрмінова выканалі сацыялістычныя абавязанні дзяржаўныя планы ў цэлым прамысловасць гарадоў Віцебска, Оршы і Полацка, Лепельскага, Сіроцінскага, Ушацкага, Талачынскага, Бешанковіцкага і іншых раёнаў. 20 буйнейшых прадпрыемстваў, у тым ліку станказавод імя Камінтэрна, Віцебская мэблевая фабрыка, мясакамбінаты, кафельна-плітачны завод, махорачная фабрыка, цагельны завод № 37 і іншыя завяршылі гадавую праграму яшчэ ў кастрычніку—лістападзе мінулага года.

Датэрмінова справіўся з выкананнем прынятых абавязацельстваў калектыў панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ», які даў звыш плана 793 тысячы пар панчошна-насочных вырабаў, 539 тысяч штук бялізнавага трыкатажу. Калектыў дывановага камбіната выпусціў звыш плана 18 тысяч квадратных метраў дывановых вырабаў.

Вядома, што на мінулай партыйнай канферэнцыі рэзкай крытыцы падвяргалася кіраўніцтва фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» за сістэматычнае невыкананне прадпрыемствам вытворчага плана. Цяпер гэтае прадпрыемства стала адным з перадавых у вобласці і на працягу пяці кварталаў трымае першынство ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве.

Гэта стала магчымым таму, што кіраўніцтва фабрыкі (т. Седуноў), партыйная, прафсаюзная і камсамольская арганізацыі (тт. Меляшчова, Дзядова, Кандрацьева) сталі больш удзяляць увагі пытанням арганізацыі працы, развіццю творчай ініцыятывы ўсяго калектыву. На фабрыцы разгарнулася масавае сацыялістычнае спаборніцтва за перавод у 1958 годзе ўсяго калектыву на 7-гадзінны рабочы дзень. У цяперашні час больш палавіны брыгад выконвае зменныя заданні за 7 гадзін.

Але гэта зусім не значыць, што ў нас няма недахопаў у кіраўніцтве прамысловасцю. Асобныя партыйныя камітэты яшчэ мала ўдзяляюць увагі рабоце адстаючых прадпрыемстваў і замест паўсядзённай арганізатарскай і палітычнай работы з народам усю справу зводзяць да прыняцця шматлікіх рашэнняў, глыбока не ўнікаюць у эканоміку вытворчасці, не аналізуюць справаздачы і балансы і не робяць з іх неабходных вывадаў.

Аб гэтым гаворыць той факт, што з 306 прамысловых прадпрыемстваў вобласці 69 не выканалі гадавы план і недадалі прадукцыі на 31 мільён рублёў, у тым ліку 15 прадпрыемстваў, падпарадкаваных саўнаргасу, 26 — абласному ўпраўленню прамысловасці і 17 — абласпажыўсаюзу. Больш двух год не выконвае планы прамысловай вытворчасці Аршанскі сілікатны завод. Толькі ў 1957 годзе ім недададзена 8,5 тысячы кубаметраў сілікатных блокаў. Ганебнае адставанне з-за чыста ўнутраных непаладкаў кіраўнікі прадпрыемства прабуюць растлумачыць радам знешніх прычын. Можна растлумачыць дрэнную работу торфапрадпрыемства «XX год Кастрычніка», Расонскага ільнозавода, папяровай фабрыкі «Чырвоная зорка» і некаторых іншых.

Страціў былую славу перадавога прадпрыемства Аршанскі ільнокамбінат. Дырэктар т. Сямёнаў, сакратар партбюро т. Бярэзін супакоіліся на дасягнутым, не клапоцяцца аб выкарыстанні велізарных магчымасцей, якія ёсць на камбінаце. У выніку ільнокамбінат у трэцім квартале 1957 года перастаў выконваць дзяржаўны план, а за год недадаў каля двух мільёнаў метраў ільняных тканін. Падаражэнне сабекошту ўсёй таварнай прадукцыі склала звыш 2,5 мільёна рублёў.

Аршанскі гарком партыі, ведаючы аб нездавальняючай рабоце гэтых прадпрыемстваў, не прыняў своечасовых мер да ліквідацыі недахопаў, аказаўся па сутнасці ў хвосце падзей, калі недахопы перараслі ў сур'ёзныя ўпушчэнні, а адставанне прадпрыемстваў набыла зацяжны характар. Ды і ў гэтым няма нічога дзіўнага, бо Аршанскі гарком КПБ замест паўсядзённай арганізатарскай работы на месцах займаўся засядацельскай мітусней, губіць жывую справу ў паперах і пасяджэннях. Дастаткова сказаць, што толькі за 1957 год у гаркоме праведзена каля 100 рознага роду пасяджэнняў, сходаў і нарад.

Гаркомы і райкомы партыі, многія пярвічныя партыйныя арганізацыі цярпіма адносяцца да тых гаспадарнікаў, якія, прыкрываючыся станоўчымі паказчыкамі па выпуску валавой прадукцыі, не выконваюць план у асартыменце. У выніку гадавое заданне не выканана па 13 відах галоўнейшых вырабаў, у тым ліку па вытворчасці драўляна-валакністых пліт, зборнага жалезабетону, ільняных тканін, паперы, паліва і інш.

Кіраўніцтва мясцовай і рэспубліканскай прамысловасці (тт. Ткачоў, Далжанкоў) па-ранейшаму не вышукваюць магчымасці для павелічэння выпуску прадукцыі за кошт мясцовай сыравіны і асабліва вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. За 1956 і 1957 гады выкарыстана каля 23 мільёнаў штук абпаленай цэглы, больш 1,5 мільёна штук пясчана-цэментнай чарапіцы, 2.120 ванн. За гэты ж перыяд мясцовай прамысловасцю недадзена 63 тыс. тон торфу.

У вельмі закушчаным стане на машынабудаўнічых прадпрыемствах знаходзяцца ліцейныя цэхі, у якіх да гэтага часу пераважае прымітыўная, устарэлая тэхналогія, у выніку чаго прадукцыйнасць працы і якасць ліцця вельмі нізкія. Калі на перадавых прадпрыемствах краіны знімаецца з аднаго квадратнага метра ліцейнай плошчы 5—6 тон ліцця і брак не перавышае 2—3 працэнтаў, то на нашых заводах з аднаго квадратнага метра знімаецца 3—3,5 тоны і брак дасягае 13 працэнтаў.

Не лепш абстаіць справа з выкарыстаннем магутнасцей і на прадпрыемствах будаўнічых матэрыялаў. Напрыклад, на Віцебскім камбінаце будматэрыялаў з аднаго кубічнага метра кальцавой печы знімаецца 1.765 штук цэглы, а на маскоўскіх прадпрыемствах — каля 2,5 тысяч штук.

На радзе прадпрыемстваў не развіваецца масавае вынаходніцтва і рацыяналізацыя. Нярэдкія выпадкі, калі да рацыяналізатараў і вынаходнікаў прысасваюцца аматары пагрэць рукі за чужы кошт. Так, на Віцебскай мэблевай фабрыцы вакол сумленных рацыяналізатараў дзейнічае кучка «дзялкоў» накшталт Нісневіча, Багарада і іншых, ператварыўшых рацыяналізатарскую работу ў сродак асабістай нажывы і прымушаўшых аўтараў прапаноў уключаць іх у лік сааўтараў. І не выпадкова, што 50 працэнтаў выплачаных сум за рацыяналізацыю трапіла ў кішэні гэтых хапуг.

Многія прадпрыемствы працягваюць выпускаць прадукцыю нізкай якасці. Станкабудаўнічы завод імя Кірава часам выпускае няякасныя станкі. На Віцебскім заводзе металабытавых вырабаў мелі месца факты, калі пры кантрольнай праверцы якасці прадукцыі ўся прадпраяемая партыя забракоўвалася або вярталася ў цэх для выпраўлення. Абутковай фабрыкай «Чырвоны Кастрычнік» за 1957 год уплочана па рэкламацыях штрафаў 264 тысячы рублёў, пераведзена ў паніжаныя гатункі звыш 21 тыс. пар абутку і вернута для выпраўлення 2.878 пар. Нізкай якасці выпускаюцца будаўнічыя матэрыялы. Значная частка прадпрыемстваў не выконвае план па зніжэнню сабекошту прадукцыі і накапленняў.

Адзінай галіной прамысловасці, якая развівалася, была харчовая прамысловасць. Але і тут не ўсё гладка. Не выконвае план Віцебскі мясакамбінат, Полацкі і Ушацкі мясакамбінаты, Віцебскі і Полацкі маслазаводы, Ушацкі і Талачынскі кансервавы заводы, Віцебскі і Полацкі піваварныя заводы, Віцебскі і Полацкі хлебазаводы, Віцебскі і Полацкі гарадскія лазні, Віцебскі і Полацкі гарадскія і раённыя аптэкі, Віцебскі і Полацкі гарадскія і раённыя гарадскія і раённыя гарадскія і раённыя